# ЛЕКЦЫЯ 3-4.

АСНОЎНЫЯ ПАНЯЦЦІ КАГНІТЫЎНАЙ ЛІНГВІСТЫКІ

- **Кагнітыўная лінгвістыка** — кірунак у мовазнаўстве, які даследуе праблемы суадносін мовы і свядомасці, ролю мовы ў канцэптуалізацыі і катэгарызацыі свету, у пазнавальных працэсах і абагульненні чалавечага досведу, сувязь асобных кагнітыўных здольнасцяў чалавека з мовай і формы іх узаемадзеяння.

Кагнітыўная лінгвістыка (канец XX стагоддзя) разглядае мову як форму інтэлектуальнай дзейнасці чалавека, у якой замацаваліся вынікі пазнавальнай дзейнасці.

Кагнітыўная лінгвістыка грунтуецца на палажэнні аб тым, што паводзіны і дзейнасць чалавека вызначаюцца ў значнай ступені яго ведамі, а моўныя паводзіны - моўнымі ведамі.

**Мэта кагнітыўнай лінгвістыкі** - зразумець, як ажыццяўляюцца працэсы ўспрымання, катэгарызацыі, класіфікацыі і асэнсавання свету; як адбываецца назапашванне ведаў; якія сістэмы забяспечваюць розныя віды дзейнасці з інфармацыяй.

Даследаванні сучаснай кагнітыўнай лінгвістыкі вядуцца ў асноўным па наступных напрамках:

**а)** віды і тыпы ведаў, якія змяшчаюцца ў моўных знаках, і механізм атрымання са знакаў пэўных ведаў (г.зн. правілы інтэрпрэтацыі);

**б)** умовы ўзнікнення і развіцця знакаў і законы, якія рэгулююць іх функцыянаванне;

**в)** суадносіны моўных знакаў і культурных рэалій, адлюстраваных у іх.

Галоўнай задачай кагнітыўнай лінгвістыкі з'яўляецца «сістэмнае апісанне і тлумачэнне механізмаў чалавечага засваення мовы і прынцыпы структуравання гэтых механізмаў»

Кагнітыўная лінгвістыка – напрамак у лінгвістыцы, у цэнтры ўвагі якога знаходзіцца мова як агульны кагнітыўны механізм.

У межах дадзенага кірунку можна вылучыць некаторыя пункты гледжання на сутнасць і структуру мовы, якія больш ці менш паслядоўна адстойваюцца кагнітывістамі:

- Адмаўленне аўтаномнасці мовы (сцвярджаецца, што не існуе ўласна моўных механізмаў, а моўныя аперацыі, моўная дзейнасць абслугоўваюцца агульнакагнітыўнымі структурамі і механізмамі);

-Адмаўленне многімі даследчыкамі існавання такіх уласцівасцяў мовы, як глыбінная структура, трансфармацыя, моўнае правіла (г.зн. непрыманне фундаментальных паняццяў генератыўнай лінгвістыкі);

- Разгляд семантыкі моўных адзінак у адпаведнасці з ментальнымі структурамі носьбіта мовы (з'яўленне тэорыі «натуральных класаў», тэорыі прататыпаў, семантычнага апісання з дапамогай структур кагнітыўных прымітываў);

- Павелічэнне ролі метафары ў структураванні ментальнага лексікону (кагнітывісты даказалі, што метафарычна пераносы не абмежаваныя сферай мастацкіх прыѐмаў; яны пераймаюць увесь слоўнік, арганізуючы значныя пласты лексікі, распаўсюджваючыся на граматыку).

У сферу інтарэсаў кагнітыўнай лінгвістыкі ўваходзіць вывучэнне ментальных асноў разумення і прадукавання мовы з пункту гледжання таго, як структуры моўных ведаў прадстаўляюцца (рэпрэзентуюцца) і ўдзельнічаюць у перапрацоўцы інфармацыі.

Кагнітыўная лінгвістыка характарызуецца імкненнем даць моўным фактам і моўным катэгорыям псіхалагічнае тлумачэнне і так ці інакш суаднесці моўныя формы з іх ментальнымі рэпрэзентацыямі і з тым досведам, які яны адлюстроўваюць у якасці структуры ведаў.

Кагнітыўная лінгвістыка аперуе ўласнай тэрміналагічнай сістэмай, якая характарызуецца не столькі новымі тэрмінамі, колькі ўдакладненымі і ўніфікаванымі, ужо наяўнымі ў лінгвістыцы або запазычанымі з іншых галін навуковых ведаў.

Асноўнымі тэрмінамі кагнітыўнай лінгвістыкі з'яўляюцца «кагніцыя», «катэгарызацыя», «карціна свету», «канцэпт», «фрэйм», «сцэнар», «скрыпт», «канстанты культуры», «канцэптасфера»

**Кагніцыя** - працэс набыцця ведаў і вынікі гэтага працэсу. Гэта ўспрыманне свету, назіранне, катэгарызацыя, мысленне, размова, уяўленне і інш. псіхічныя працэсы ў іх сукупнасці.

**Катэгарызацыя - 1)** у вузкім сэнсе - падвядзенне з'явы пад пэўную рубрыку вопыту, катэгорыю; **2)** у шырокім сэнсе - працэс дзялення вонкавага і ўнутранага свету чалавека на катэгарыяльныя сферы, суадносная з істотнымі характарыстыкамі іх функцыянавання і існасці.

**Канцэпт** - аператыўны змястоўны кампанент свядомасці і ведаў аб свеце. Асаблівая адзінка свядомасці, якая адлюстроўвае змест вынікаў чалавечай дзейнасці і працэсаў пазнання свету і якой аперуе чалавек у працэсе мыслення.

**Канстанты культуры** - канцэпты, якія з'яўляюцца ў глыбокай старажытнасці і прасочваюцца праз погляды сучасных носьбітаў мовы; «нейкі пастаянны прынцып культуры»

**Канцэптасфера** - сукупнасць канцэптаў, з якіх складаецца светаразуменне носьбіта мовы.

**Скрыпт** - спосаб прадстаўлення аперацыйнай інфармацыі; набор ведаў пра тое, як паступаць і як зробяць іншыя ў канкрэтных стэрэатыпных сітуацыях (напрыклад, «ролі» афіцыянткі, кліента, згоншчыка самалёта і да т.п.).

**Сцэнар** - спосаб прадстаўлення аперацыйнай інфармацыі; дынамічны разумовы вобраз (напрыклад, розныя сцэнары моўнага ўзаемадзеяння)

**Фрэйм** - спосаб прадстаўлення аперацыйнай інфармацыі; структура ведаў для прадстаўлення стэрэатыпнай сітуацыі (напрыклад, сітуацыя аплаты праезду, святкавання дня нараджэння і да т.п.).

**Моўная карціна свету** - увесь комплекс ведаў і ўяўленняў дадзенай моўнай супольнасці аб свеце, зафіксаваны ў мове, перш за ўсѐ ў яе лексічным і фразеалагічным складзе.

Пытаннямі, звязанымі з моўнай выявай свету, канцэптуалізацыяй і канцэптамі, нацыянальным кампанентам і іншымі праблемамі кагнітыўнай лінгвістыкі, займаліся вядомыя расійскія навукоўцы (Е.С. Кубракова, Р.І.Павілёніс, Б.А.Сярэбранікаў, А.А.Уфімцава, і інш.) і замежныя (А.Вежбицкая, Е.Барт і інш.).

Кагнітыўныя пошукі сучасных лінгвістаў выявіліся ў мностве падыходаў і спосабаў вывучэння мовы, што спрыяла асэнсаванню шматграннасці мовы, пераасэнсаванню погляду на функцыянаванне мовы, яго сістэмную арганізацыю і камунікатыўныя асаблівасці адзінак лексіка-семантычнай сістэмы. Сталі выяўнымі пытанні пра месца і ролю мовы ў жыцці чалавека, пра ўзаемадзеянне розных фактараў з жыцця чалавека з семіялагічнай і семіятычнай арганізацыяй мовы.

Дзякуй за ўвагу!